# РАЗВІЦЦЁ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ШЛЯХАМ ВЫКАРЫСТАННЯ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

***Сіманюк К.А.***
*студэнтка 2 курса УА "БрДУ імя А.С. Пушкіна",*
*г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Канцавая Г.М., кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Абавязковым кампанентам пачатковай літаратурнай адукацыі малодшых школьнікаў з'яўляецца творчая дзейнасць, якая прадугледжвае не толькі працу на аснове прачытанага, але і ўласную творчасць вучняў.

Пры выкарыстанні творчых заданняў на ўроках літаратурнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі настаўніку неабходна прытрымлівацца наступных прынцыпаў: актывізацыі ўяўлення, актыўнай дзейнасці, сутворчасці, уліку двухбаковай сувязі, дыялогу [1]. Творчая дзейнасць дазваляе вучням раскрыць і актывізаваць свае здольнасці; няўпэўненым школьнікам – развіць ініцыятыву, кемлівасць, мысленне. Да творчых заданняў, якія рэалізуюцца на ўроках літаратурнага чытання з мэтай развіцця звязнага маўлення, адносяцца гульнявыя прыёмы (гульні-драматызацыі, інсцэніроўкі), творчае чытанне, творчыя пераказы, праблемныя пытанні, слоўнае маляванне па прачытаным, напісанне сцэнарыя мультфільма, сінквейна па творах, маналог ад асобы героя твора або інтэрв'ю з героем твора, пераблытаныя лагічныя ланцужкі, прыёмы «Дрэва прадказанняў», «Казка наадварот» і інш. Прапанаваныя заданні могуць выкарыстоўвацца як на ўроках, так і ў пазаўрочнай дзейнасці.

Выкананне творчых заданняў прадугледжвае некалькі этапаў. Першапачатковым этапам працэсу выканання творчага задання з'яўляецца спецыяльная падрыхтоўчая праца, падчас якой адбываецца знаёмства вучняў з тэкстам твора, асэнсаванне творчай задачы, выбар з тэксту таго матэрыялу, які неабходны для яе рашэння, абдумванне зместу гэтага матэрыялу, яго рэдагаванне з пункту гледжання творчай задумы.

На этапе аднаўлення ва ўяўленні прачытанага адбываецца творчае пераасэнсаванне тэксту, афармленне яго ў выглядзе разумовага «плана», «праекта» новай мастацкай формы: ілюстрацыі, сцэны, імправізацыі і інш.

Наступным этапам працэсу выканання творчай працы з'яўляецца слоўнае афармленне ўзніклага ўяўлення. На гэтым этапе праводзіцца гутарка, падчас якой удакладняецца і канкрэтызуецца творчая ідэя, абмяркоўваецца яе развіццё, неабходныя дэталі. Малодшыя школьнікі суадносяць вобразы, якія ўзніклі ва ўяўленні, з тэкстам, ад нечага адмаўляюцца, нешта прымаюць. Узнікае некалькі варыянтаў выканання творчага задання. На гэтым этапе малодшыя школьнікі праяўляюць усе свае здольнасці да маўленчай дзейнасці (уменне раскрыць тэму, падабраць адпаведныя маўленчай сітуацыі моўныя сродкі, уменне выслухаць, удакладніць, выправіць што-небудзь у сваім маўленні і т.д.), слоўна афармляючы ўзніклае ўяўленне, сваю будучую творчую працу.

На чацвёртым этапе адбываецца канчатковая дапрацоўка праекта: маляванне карцін, разыгрыванне сцэнкі ці цэлага спектакля і інш.

Напрыклад, пасля вывучэння ў 3 класе раздзела «Чалавек без Радзімы, што салавей без песні» малодшымі школьнікамі быў падрыхтаваны праект «Мая малая Радзіма», а пасля знаёмства з творамі раздзела «Добры чалавек і жывёлу шкадуе» – праект «Прыроды мы адданыя, надзейныя сябры», у якіх вучні прадэманстравалі свае здольнасці ў ролі мастакоў, рэдактараў, сцэнарыстаў, паэтаў, рэкламных агентаў.

Рэпазіторый БрДУ

Такім чынам, творчая праца з'яўляецца вядучым элементам зместу пачатковага этапа літаратурнай адукацыі. Творчыя заданні ствараюць умовы для развіцця маўлення і творчых здольнасцяў вучняў, дазваляюць разнастаіць ўрокі літаратурнага чытання.

З мэтай выяўлення ўзроўню развіцця звязнага маўлення малодшых школьнікаў намі была праведзена вопытна-даследчая праца, у якой удзельнічалі 22 вучні 3 класа ДУА «ВПК дзіцячы сад – пачатковая школа № 5 г. Брэста». На падставе вылучаных крытэрыяў (цэласнасць выказвання, захаванне галоўнай думкі выказвання, выкарыстанне лексічных граматычных сродкаў, самастойная пабудова выказвання) былі падабраны дыягнастычныя сродкі: методыка «Апавяданне па аналогіі» і методыка «Тэксты розных жанраў», якія дазволілі выявіць узровень развіцця звязнага маўлення малодшых школьнікаў (высокі, сярэдні, нізкі). Методыка «Апавяданне па аналогіі» прадугледжвала складанне апавядання па аналогіі з прачытаным. Падчас правядзення методыкі «Тэксты розных жанраў» вучням неабходна было скласці тэксты розных жанраў з апорай на прапанаванае ім двухрадкоўе.

Праведзенае даследаванне паказала, што ў 3 класе пераважае высокі і сярэдні ўзроўні развіцця звязнага маўлення. Атрыманыя вынікі з'яўляюцца сведчаннем таго, што з малодшымі школьнікамі праводзіцца сістэматычная і мэтанакіраваная праца па развіцці звязнага маўлення.

Такім чынам, выкарыстанне заданняў творчага характару на ўроках літаратурнага чытання (творчыя праекты, ілюстраванне, складанне крыжаванак, небыліц, казак, павучальных апавяданняў, назвамі якіх з'яўляюцца прыказкі, інсцэніраванне і інш.) садзейнічае эфектыўнаму развіццю звязнага маўлення дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

**Літаратура**

1. Прохорова, Т.Н. Творческое развитие детей на уроках литературного чтения [Электронный ресурс] / Т.Н. Прохорова, М.В. Ляпина // Гуманитарные исследования. – 2015. – № 2 (54). – С. 104–107. – Режим доступа: https://humanities.asu.edu.ru/files/2(54)/104-107.pdf. – Дата доступа: 02.04.2021.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИКТ НА УРОКАХ МАТЕМАТИКИ В НАЧАЛЬНЫХ КЛАССАХ

***Синепалова М.С.***
*студентка ГБПОУ «Дзержинский педагогический колледж»,*
*г. Дзержинск, Нижегородская область, Российская Федерация*
Научный руководитель – Шагина А.Н.

В настоящее время общество особенно тем, что его характеристика состоит в исключительно быстром развитии информационных и коммуникационных технологий, а их возможности становятся беспрецедентными для развития человека, для эффективного решения большинства профессиональных, экономических, социальных и бытовых проблем.

Актуальность данного исследования состоит в том, что сегодня для становления учителя как личности необходимо его приобщение к информативно-коммуникативным возможностям современных технологий, овладение подлинной информационной культурой, которая открывает учителю и его ученикам возможность достичь одну из главных целей образования: от диалога людей и культур через выявление и развитие творческого потенциала личности прийти к взаимообогащению и продуктивному взаимодействию человеческих сообществ.

Проблеме использования информационных коммуникационных технологий в образовательном процессе (включая уроки в начальной школе) были посвящены теоретические, в том числе и монографические исследования ученых, которые представлены на слайде.

Однако до сих пор в педагогической литературе вопрос о применении ИКТ разработан недостаточно, спорные проблемы использования данных технологий, окончательно не разрешены, а главное, постоянно возникают трудности в педагогической



Репозиторий ВГУ